*Іван Адамовіч*

**КУЛЬТУРА ЗНІКЛАЙ ВЁСКІ**

Чалавек, які не ведае гісторыю свайго роду, сваёй зямлі не можа быць па-сапраўднаму шчаслівым, бо ён губляе самае каштоўнае ў жыцці –духоўнае багацце.

Беларуская культура шмат страціла за вякі сваёй трагічнай гісторыі. Тым не менш, кожны куток на Беларусі яшчэ мае сваю самабытнасць і непаўторнасць. Адметнасць культурнай прасторы стварае своеасаблівы вобраз свету, у якім фарміруецца духоўны воблік чалавека. Надзвычай важна, каб кожны ўжо змалку адчуваў і ўсведамляў сябе носьбітам і спадкаемцам культурнай традыцыі, якая складвалася ў той ці іншай мясцовасці на працягу стагоддзяў. А гэта стане магчымым тады, калі мы будзем спасцігаць не толькі гатовыя веды пра сваю зямлю, але сур'ёзна зоймемся пошукавай і даследчай працай па вывучэнні свайго краю.

Калі я прыязджаю да сваёй бабулі ў вёску Сасноўшчына, то часта прысутнічаю пры гутарцы вяскоўцаў, якія прыходзяць «на сяло». Адразу перада мною ўзнікаюць малюнкі мінулага жыцця людзей, якія насяляюць вёску. Але найбольш мяне цікавіць той час, калі яны былі жыхарамі зніклай у 1958 годзе вёскі Вузляны.

Тады, калі глядзеў на вяскоўцаў, я разумеў, што сярод іх усё менш застаецца жыхароў той зніклай вёскі. Таму з'явілася жаданне занатаваць іх успаміны пра быт, традыцыйную культуру, абрады і звычаі, рамёствы і мастацкую творчасць. Я захацеў атрымаць поўныя веды аб мясцовасці, дзе нарадзіліся і правялі сваё дзяцінства мое дзяды і прадзеды, якіх выносілі на могілкі менавіта з той беднаватай вузлянскай хаты, што потым перавезлі ў новую вёску.

Таму расповед пра свой род я пачну з гісторыі роднай вёскі Вузляны. У 1934–1936 гадах яе рассялілі па хутарах, а ў 1956 годзе пачалося перасяленне з хутароў, якое закончылася ў 1958 годзе.

Вёска Вузляны так называлася, бо была вузкаю і мела толькі адну вуліцу. Потым гэту вёсачку рассялілі па хутарах, якія былі аб'яднаны пад той жа назвай, што і вёска. Хутар аднаго гаспадара размяшчаўся за 400–500 метраў ад другога. Па ўспамінах жыхароў, сістэмы ў рассяленні не было: сваякі маглі знаходзіцца па розныя бакі вёскі.

У вёсцы пражывала ўсяго 47 сем'яў, сярод якіх былі і сваякі, і жыхары з аднолькавым прозвішчам. Дзесяць – з прозвішчам Лазавік, шэсць – Навойчык, па пяць – Сяржант і Барташонак, чатыры – Місун, па дзве сям'і з прозвішчамі Аўгусціновіч і Панарад, і па адной – Шкель, Віркоўскія, Атрошка, Стукін, Гапановіч, Ляшковіч, Вайцяшонак, Тонкавіч, Атрошчык, Юрэвіч, Ляўко, Чачык і Язневіч.

У Вузлянах да рассялення быў свой калгас, які праіснаваў толькі 2-3 гады (дзесьці з 1949 да 1953). Потым усе вяскоўцы ўвайшлі ў калгас вёскі Даўгінава. На переезд былі выдаткаваны грошы з калгаса, якія потым вяскоўцы адпрацоўвалі.

Па веравызнанні пераважалі праваслаўныя, было многа шматдзетных сем'яў (ад 5 да 14 дзяцей). Напрыклад, мая прабабуля мела дзевяць дзяцей, рана страціла мужа і падымала іх адна.

Вузляны ў сваім паўсядзённым быце была нічым не адметная ад іншых вёсак Беларусі. Мужчыны зранку да вечара працавалі ў полі ад вясны да зімы. Парадка ў хаце павінны былі трымаць дзеці. Перад святам ва ўборцы ўдзельнічалі амаль усе члены сям'і.

Вясною, калі пачыналася сяўба, гаспадар з гаспадыняй ішлі ў поле з грамнічнай свечкай, вербачкамі і боханам хлеба. Абыходзілі свае загоны з малітваю і вярталіся дадому. Пачыналі сеяць пасля старэйшага гаспадара ў вёсцы. Лічылі, што ён лепш ведае, калі пачынаюць сяўбу. На Юр'е, 6 мая, выганялі жывёлу на пашу, якую пасвілі, у асноўным, дзеці. Зажынкі агульнымі не былі. Кожны гаспадар выбіраў свой час. У поле ішла гаспадыня з сярпом, жала першы невялічкі сноп, які называлі «гаспадар» і ставілі яго на покуць. На тым месцы, дзе быў зжаты сноп, закопвала гаспадыня кавалачак хлеба, каб быў добры ўраджай. А на другі дзень пачыналася жніво.

Хоць у бліжэйшай вёсцы Даўгінава на той час існавала 7 хлебапякарань, хлеб кожная сям'я выпякала сама. У кожнай хаце была свая дзяжа, да якой адносіліся як да жывой. Дзяжу ніколі не ставілі на падлогу. Перад выпечкай гаспадыня чытала малітву і рыхтавала ручнік, які называлі «надзежнік». У нашай вёсцы «надзежнікі» былі без вышыўкі, але з аднаго боку ручнік аздаблялі сплеценымі «коскамі». Ні на што іншае гэты ручнік ніколі не выкарыстоўвалі.

У кожнай хаце стаяла аднолькавая мэбля: стол, лавы, табурэткі, якія перад святам выносілі да сажалак, што знаходзіліся амаль ля кожнай хаты, і шкраблі да бляску. Дагэтуль захавалася сажалка, якая размяшчалася каля хаты Ляўко Сяргея. Яе так і называюць – Ляўкова. Астатнія былі знішчаны падчас асушэння балот.

Жыхары вёскі хадзілі на працу да паноў або па суботах у Даўгінава да яўрэяў, якія ў гэты дзень самі не працавалі, але за зробленую работу плацілі.

Вясковыя дзеці хадзілі ў пачатковую школу ў Апенькі. Там вучыліся чатыры гады. Прадметы выкладаліся на беларускай і польскай мове да 1939 года, а потым – толькі на беларускай. Вывучалася і руская мова і літаратура як прадмет. Потым у 5 клас паступалі ў Даўгінава, здаючы іспыты. Да 1939 года ў школе праводзіліся ўрокі праваслаўнымі і каталіцкімі святарамі[3,5].

Яшчэ са школы вяскоўцы засвоілі, што ёсць святы хрысціянскія і язычніцкія, таму ў вёсцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вузляны больш пераважалі хрысціянскія святы. Напрыклад, ніколі не святкавалі Купалле. Толькі пасля перасялення
і аб'яднання ў саўгас сталі хадзіць на Купалле, якое праводзілі работнікі культуры.

Вялікія святы нашай зніклай вёсачкі былі звязаны са звычайным царкоўным календаром. Вялікдзень, Благавешчанне, Радуніца, Тройца, Спас, Пакровы, Дзяды, Вялікдзень, Каляды і іншыя святы і прысвяткі,
а таксама пасты праводзілі вяскоўцы як і паўсюдна на Беларусі.

Перад Вялікаднем да чацвярга, які называюць чыстым, старанна прыбіралі ў хаце, мыліся ў лазні. А ў суботу зранку завешвалі на вокны папяровыя фіранкі (калі яны былі), на абразы – набожнікі, замешвалі ў дзяжы цеста на пірагі і з абеда распальвалі ў печы. Кожная гаспадыня рыхтавала святочныя стравы: смажыла мяса, каўбасу, варыла цыбульнае шалупінне і фарбавала ў яго адвары велікодныя яйкі.

У суботу прыходзіла старэйшая жанчына са сваякоў і пыталася ў дзяцей: ці не елі што з мяса. Калі хто еў, то пужалі падпеччам. Была добрая традыцыя адорваць адзін аднаго на Вялікдзень святочнымі яйкамі. Вечарам з кожнай сям'і людзі ішлі ў храм на ўсяночную. З сабою бралі  пірог, яйкі, соль, хлеб. Набажэнствы ў гэтую ноч заканчваліся гадзін каля чатырох, потым святары асвячалі пасху.

Раніцай мыліся вадой, у якую клалі чырвонае яйка, каб быць увесь год чыстым і здаровым (чырвоным і гладкім, як яйка). Кожная гаспадыня накрывала святочны стол, за які, папярэдне памаліўшыся Богу, садзіліся, каб разгавецца. Пасля доўгага сямітыднёвага посту можна было ўволю паласавацца рознымі стравамі. Есці пачыналі з асвечанага яйка, солі і хлеба.

Самая любімая гульня на Вялікдзень – біткі. Стукаліся святочнымі яйкамі, і пераможцам аказваўся той, у каго яно заставалася цэлым. Гаспадар «мацака»  забіраў сабе разбітыя яйкі іншых удзельнікаў гульні. Яшчэ гулялі з яйкамі, качаючы іх. Быў зроблены спецыяльны латок, па якім пускалі яйка. Чыё далей пакоціцца, той перамагае і забірае яйкі астатніх удзельнікаў гульні.

Катэгарычна забараняліся на Вялікдзень бойка і сваркі. Мужчыны і хлопцы збіраліся ў вялікія, чалавек да 10 – 20, гурты валачобнікаў, сярод якіх абавязкова прысутнічаў механоша, астатнія называліся падхватнікамі, іх суправаджала музыка. Валачобнікі абыходзілі ўсе мясцовыя двары, спыняючыся пад вокнамі кожнага дома, дзе спявалі «васолы», пераважна велічальнага зместу, услаўляючы гаспадара, яго руплівую працу, жадаючы яму ўраджаю на ніве, прыплоду ў хляве, прыбытку ў хаце. Хвалілі валачобнікі і гаспадыню за яе працавітасць і розум. Добрыя словы гучалі ў адрас дзяцей. Валачобнікаў гаспадары адорвалі падарункамі: салам, каўбасамі, сырам і абавязкова чырвонымі яйкамі. З другога дня Пасхі кожная сям'я наведвала сваякоў і суседзяў. І гэтыя завітанні ў госці працягваліся цэлы тыдзень, на працягу якога нічога не рабілі. З першага дня свята і да Узнясення віталіся словамі: «Хрыстос уваскрэс!» і адказвалі: «Ваісціну ўваскрэс!» [3,7].

У вёсцы жылі людзі рознага веравызнання, але павага да свята, нават не свайго, была падкрэсленай. Калі святкавалі каталікі, праваслаўныя ўтрымліваліся ад працы і наадварот. Святочныя застоллі праходзілі як у коле сям'і, так і з запрашэннем у госці іншых сваякоў.

Шырока святкавалі вяскоўцы Нараджэнне Хрыстова. Ад 7 да 21 студзеня  вечарамі нічога не рабілі, нават не ткалі, гэтыя вечары называлі святымі. Калядныя вечары вызначаліся яшчэ ігрышчамі і вячоркамі, на якія збіралася, у асноўным, моладзь. Звычайна выбіралі большую хату ў вёсцы. Музыканты былі са сваіх: гарманіст і скрыпач. Пасля вячорак хлопцы бывала біліся з кавалерамі, якія прыходзілі з іншых вёсак. Паміж сваімі ніколі не было спрэчак. Вячоркі праводзіліся не толькі на Каляды, але ніколі не ладзіліся ў пост і напярэдадні хрысціянскіх святаў.

Сярод вяскоўцаў вялікіх майстроў-рамеснікаў можна назваць каваля  Навойчыка Сцяпана, якога часцей звалі Кавалём. Дзяцей яго таксама клікалі Кавалёвымі: Ганна Кавалёва. Потым з'явіліся кавалі сярод маладзейшых: Лазавік Андрэй і Закалінскі Мечыслаў, якім праца вельмі падабалася, а людзі хвалілі іх вырабы. Асноўнымі відамі работ былі акоўка транспартных сродкаў (калёсы, сані), падкоўка коней, зубленне сярпоў, выраб сельскагаспадарчага інвентару, слясарнага і сталярнага інструменту, прыладаў хатняга ўжытку, дэталяў для жытла і мэблі (ручкі, завесы, клямкі і г.д.)[3,8].

Жанчыны займаліся ткацтвам і вышыўкай. Кросны былі амаль у кожнай хаце. Авечак стрыглі ўвосень і ўвесну, часалі воўну на грабянцах, пралі і ткалі. Каб атрымаць сукно, з якога шылі верхняе адзенне, тканіну валялі.

Для аздаблення хаты стваралі вырабы з саломкі: шкатулкі, цацкі, павукі, упрыгожанні для ікон. Таксама з саломы выраблялі сявенькі, карабы. У кожнай хаце быў свой майстар, бо, каб вяскоўцы лічылі цябе добрым гаспадаром, трэба было ўсё ўмець[3,8].

З перасяленнем многае змянілася ў быце і традыцыях былых жыхароў вёскі Вузляны. Жыхары зніклай вёскі Вузляны часта ўспамінаюць, як яны жылі бедна, але шчасліва. Не хапае былой прыгажосці святкавання, не хапае будзённых песень, якія гучалі вечарамі за калаўротам, не хапае вясёлых вячорак. Так хочацца захаваць культурную спадчыну і традыцыі продкаў, якія дапамагалі ім жыць і людзьмі звацца.

## Спіс літаратуры:

1. Беларусазнаўства, 8-9 класы, зборнік № 3 / склад. А.Ю. Лозка, Т.А. Арлова [і інш.]. – Мінск : Рэкл.-выд.агенцтва «Азбука», 1993. – 128 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Памяць: Гіст-дакум. хроніка Вілейскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 704 с.
3. Сямейны архіў Адамовічаў. Успаміны жыхароў зніклай вёскі Вузляны, Вілейскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ